«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

# У рэгіёнах праходзяць суды за акцыі на выходных

дапоўнена

27.03.2017 **Тэгі**: суды



**27 сакавіка ў розных рэгіёнах краіны разглядаюцца адміністрацыйныя справы затрыманых за ўдзел у акцыях пратэсту 25 і 26 сакавіка.**

**Бабруйск.** Сёння павінны адбыцца тры суды: над **Максімам Буйніцкім** (артыкул пакуль невядомы), які быў адпушчаны з ІЧУ у ноч з 25 на 26 сакавіка і адразу ж зноў быў затрыманы, над **Уладзімірам Усерам** за удзел у акцыі 12 сакавіка (арт. 23.34 КаАП) і над затрыманым падчас акцыі 26 сакавіка **Аляксеем Данілейкам**.

Каля 15.00 суды распачаліся. Справу Максіма Буйніцкага разглядае суддзя Гармаш. Буйніцкі артымаў 2 базавыя велічыні штрафу за парушэнне арт. 17.1 КаАП.

Уладзімір Усер і Аляксей Данілейка атрымалі па 5 базавых велічынь па арт. 23.34 КаАП.



---

**Барысаў.** Пачаўся суд над **Міхаілам Васільевым**, ён абвінавачваецца ў дробным хуліганстве (арт. 17.1 КаАП). Таксама сёння будуць судзіць **Ігара Ледніка**, якога 25 сакавіка затрымалі ў сябе дома.

Міхаіл Васільеў атрымаў 6 базавых. Ігар Леднік - 7 базавых.

---

**Віцебск.** Плануюцца суды над праваабаронцамі, затрыманымі пасля акцыі 26 сакавіка. Таксама будуць судзіць **Ірыну Траццякову**, на якую складзеныя два пратаколы за ўдзел у мерапрыемствах 25 і 26 сакавіка.

Леанід Свецік атрымаў 15 сутак па арт. 23.34 КаАП. На яго было складзена два пратаколы за ўдзел у акцыях пратэсту 25 і 26 сакавіка. Рашэнне прынімала нам. старшыні суда Кастрачніцкага раёна па крымінальных справах Таццяна Жураўкова.

---

**Полацк.** У 14.00 пачынаюцца суды над мясцовымі актывістамі. Будуць разгледжаная справа **Віктара Стукава** ("Свабодны прафсаюз") і **Юрыя Бельскага**.

Ужо адбыўся суд над праваабаронцам БХК Юрыем Бельскім. Ён атрымаў 2 сутак, якія ўжо адсядзіў, і таму быз адпушчаны дадому. Бельскі быў затрыманы раніцай 25 сакавіка, калі выходзіу з дому, каб паехаць у Мінск.

Віктар Стукаў аштрафаваны на 20 штраф базавых велічынь па арт. 17.1 КаАП. Суддзя Бясецкі В.Г.

---

**Гомель.** Пачынаюцца суды над удзельнікамі «Маршу недармаедаў-2» і мітынгу каля ДК таварыства глухіх на Дзень Волі. Меркавана, што адміністрацыйныя справы будуць разглядацца ў трох раённых судах — Чыгуначным, Савецкім, Гомельскім сельскім.

---

**Магілёў.** У судзе Ленінскага раёну павінны судзіць актывіста БНФ **Аляксандра Страха**, які быў актыўным выступоўцам на акцыі ў Магілёве 15 сакавіка. Яго затрымалі увечары 24 сакавіка. Час суда высвятляецца. Пакуль што старшыня суда і супрацоўнікі канцылярыі адмаўляюцца казаць, ці паступілі ўвогуле матэрыялы па яго справе ў суд.

Аляксандра Страха прывезлі ў суд. Справу будзе разглядаць суддзя Шведаў.



*Аляксандр Страх і Барыс Бухель*

Суд пачаўся ў 14.00. Высветлілася, што на Страха складзены пратакол за парушэнне ч.1 арт. 23.34 КаАП. У разглядзе справы абвешчаны перапынак да 28 сакавіка, каб Страх знайшоў абаронцу. Ён адпушчаны ў залі суда.

---

**Баранавічы.** У 15.00 пачнецца суд над актывістам, інвалідам Аляксандрам Шведам, якога пасадзілі ўвечар 24 сакавіка ў ІЧУ. Артыкул, па якім ён абвінавачаны, пакуль невядомы.

---

**Брэст.** Адбыўся суд над актывісткай Палінай Панасюк-Шарэндай, якую затрымалі перад акцыяй 25 сакавіка. Суддзя Раман Карабан прысудзіў ёй 15 базавых велічынь штрафу за "дробнае хуліганства" (арт. 17.1 КаАП).

Опубликовать




## СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ



**Праваабаронца Наталля Сацункевіч: "Задача грамадскіх назіральнікаў — прымусіць сістэму выконваць правілы"**

**У Баранавічах за ўдзел у паслявыбарчых акцыях пратэсту дзевяць чалавек асудзілі да калоніі**

**Заява аб прызнанні 13 чалавек палітычнымі зняволенымі**

**Жанчыну асудзілі па фота з Маршаў, якія захаваліся на воблачным сховішчы яе тэлефона**

## ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА





## Працягваецца ціск у зняволенні: агляд навінаў пра палітвязняў з 27 сакавіка па 11 красавіка

## Працягваецца ціск у зняволенні: агляд навінаў пра палітвязняў з 12 па 27 сакавіка

## Беларусы на "крытай": як палітвязняў працягваюць пераследаваць у калоніях (дапоўнена)

## "Гэтыя каштоўнасці не прыбраць". Як экс-палітвязні святкавалі Дзень волі ў няволі




ГАЛОЎНАЕ

## Праваабаронца Наталля Сацункевіч: "Задача грамадскіх назіральнікаў — прымусіць сістэму выконваць правілы"






ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

# Спіс палітычных вязняў

## АПОШНІЯ НАВІНЫ

У брэсцкім СІЗА памёр Аляксандр Кулініч, якога абвінавачвалі ў абразе Лукашэнкі

"Следчая адвярнулася да сцяны і заплакала". Гісторыя пенсіянера, якога асудзілі па даносе суседа за ўдзел у пратэстах

Затрыманні журналіста, прадпрымальніка, старшыні АСВОДа: хроніка пераследу 13-15 красавіка (дапоўнена)

Зорку "Што? Дзе? Калі?" Фёдара Шведава ў Гродне судзяць за данаты (дапоўнена)

У Баранавічах за ўдзел у паслявыбарчых акцыях пратэсту дзевяць чалавек асудзілі да калоніі

Музыкаў гурта Nizkiz асудзілі да 2,5 гадоў "хатняй хіміі"

Заява аб прызнанні 14 чалавек палітычнымі зняволенымі

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

## Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2024

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

## Выбары*2024









## ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre memorial

Московская Хельсинкская группа

## СЯБРОЎСТВА

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

european platform for democratic elections epde



















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

